БЕЛАРУС

Выдае Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне у ЗША
Published by Byelorussian - American Association, Inc.
Address — Адрыс: Byelorussian-American Association, Inc.
435 New Jersey Ave, Brooklyn 7, N. Y., U. S. A.
Падпіска на год $ 2.50 — Subscription per year — $ 2.50
Рэдагуе Рэдакцыйная Калегія

PRICE 10 ¢ ЧАСАПІС БЕЛАРУСАЎ У З. Г. А. BYELARUS — BYELORUSSIAN NEWSPAPER IN THE USA 10 ЦЭНТАЎ

Год III. № 14 (20) 1 Лістапада 1952 г. NEW YORK, N. Y., U. S .A. November 1, 1952 Vol. III. № 14 (20)

Задзіночаныя Нацыі

Як мы падавалі ўжо, ў Нью-Ёрку пачалася чарговая сэсія ЗН. У гэтую сусьветную арганізацыю ўваходзяць 60 гаспадарстваў, між якімі 21 гаспадарства з сярэдняй і паўдзеннай Амэрыкі. 14 англа-саксонскіх гаспадарстваў, 6 бальшавіцкіх і сатэлітных, у тым ліку й БССР, 3 афрыканскіх і 8 эўрапэйскіх. Старшынею цяперашняе сэсіі выбраны міністр замежных справаў Канады Лэстэр Пірсон. Апрача яго ёсьць 7 віцэ-старшыняў. Кажны дзень працы ЗН каштуе 100.000 даляраў. Бязумоўна, як зазначаюць некаторыя газэты, дзень вайны каштуе шмат больш.

Адчыняючы сэсію Л. Пірсон, між іншым, заявіў, што ЗН ня ёсьць нейкім „над-урадам", а толькі арганізацыяй, пабудаванай на ўзаемным шматбаковым паразуменьні дзеля забясьпечаньня міру на зямлі на дабро ўсяму чалавечеству. І гэта — заданьне нязвычайнае вагі, бяручы на ўвагу змаганьні „халоднае вайны", ды вайну ў Карэі, не гаворачы ўжо аб Індакітаі, Малайях, палажэньні ў Іране, на Блізкім Усходзе і г. д. Што сучасная сэсія ЗН мусіць вырашыць шэраг пытаньняў жыцьцёвае вагі запраўды для ўсяго чалавецтва, — аб гэтым сьветчыць ужо вялікая колькасьць сябраў кажнае дэлегацыі. Так напр. савецкая дэлегацыя, заместа сваіх звычайных 80 сяброў, мае цяпер 100, із Вышынскім, Грамыкай, Зорыным, Зарубіным ды інш. на чале. На чале амэрыканскае дэлегацыі стаяць Эчысон, Элінора Рузвэлт, Уоррэн Осьцін і колькі ведамых сэнатараў. На чале іншых дэлегацыяў стаяць замежныя міністры. Усе яны ўжо урадуюць на сэсіі, апрача Ідэна й Шумана, якія маюць прыехаць пасьля выбараў новага прэзыдэнта ЗША.

Важнейшыя пытаньні цяперашняе сэсіі ЗН гэта — Туніс і Марокка, Паўдзённая Афрыка, праблема разбраеньня, арабскія ўцекачы, інтэрнацыяналізацыя Ерусаліму ды шмат іншых. Кажнае з гэтых пытаньняў будзе вельмі цьвярдым гарэхам, бо Францыя ўжо наперад заявіла, што пытаньне Тунісу й Марокка — ейная нутраная справа. Тое самае цьвердзіць і Паўдзённая Афрыка адносна расавае няроўнасьці. Аднак, усе гэтыя пытаньні ня гэткія ўжо цяжкія ў параўнаньні да справы Карэі. Якраз дзеля змаганьня за гэтае пытаньне Крэмль прыслаў ў Нью-Ёрк столькі дэлегатаў.

І запраўды, гэтым карэйскім пытаньнем і пачалася „вайна" на прасторы ЗН між Вышынскім-Грамыка й шэфам амэрыканскае дэлегацыі — Эчысонам. Грамыка ад імя савецкае дэлегацыі ўнёс з месца прапанову аб пaклікaньні дэлегацыяў чырвонага Кітаю й Паўночнай Карэі дзеля разгляду пытаньня аб „бактэрыялягічнай вайне" ў Карэі. Гэтая прапанова Грамыкі была адкінена 46 галасамі супраць 5, пры 7 паўстрымаўшыхся. Заместа гэтае прапановы гэткаю-ж бальшынёю проці галасоў савецкага блёку была прынятая прапанова амэрыканскае дэлегацыі аб разглядзе бальшавіцкіх абвінавачваньняў адносна „бактэрыялягічнай" вайны ў Карэі. Як ведама, бальшавікі ўжо даўно выступаюць супраць кажнае спробы разгляду гэтае справы нэўтральнай камісіяй, бо самы найлепш ведаюць адзіныя магчымыя вынікі — выкрыцьцё іхнае дэмагогіі ды хлусьні.

24-га кастрычніка адбылося ўрачыстае сьвяткаваньня 7-ых угодкаў існаваньня ЗН. Пасьля агульнага прывітаньня дэлегацыяў старшынёю сэсіі Пірсонам, Эчысон меў вялікую прамову, прысьвечаную вылучна карэйскаму пытаньню, дзе ён разглядзеў яго ад самага пачатку да сучасных перамоваў у Панмунджоме.

— Мы зрабілі ўсё, што было ў нашых магчымасьцях, заявіў Эчысон, каб скончыць вайну ў Карэі, але камуністыя ня хочуць гэтага. Нам не застаецца нічога іншага, як працягваць змаганьне супраць агрэсара".

Між іншым у кулуарах ЗН із зьдзіўленьнем абмяркоўваюць паводзіны чырвоных дэлегацыяў, якія не зьявіліся на ўрачыстае паседжаньне ЗН з нагоды 7-ых угодкаў гэтае міжнароднае арганізацыі. Адсутнічалі дэлегацыі Савецкага Саюзу, Украіны, Беларусі, Польшчы й Чэха-Славаччыны. Паседжаньне было афіцыйна прысьвечанае „ахвярам, што аддалі сваё жыцьцё за ідэалы Задзіночаных Нацыяў"

26-га кастрычніка бальшавікі паўтарылі сваю прапанову аб пакліканьні дэлегацыяў Кітаю й Паўночнай Карэі дзеля разгляду савецкіх абвінавачваньняў супраць ЗША аб „бактэрыялягічнай" вайне. Галасавалі ізноў, вынікі: 43 супраць, 7 — за; 11 — устрымаліся. Урэшце была прынятая прапанова, якая забараняе вяртацца да гэтага пытаньня. Далей бальшавікі ўнесьлі прапанову адабраць мандат дэлегацыі нацыянальнага Кітаю й прызнаць яго чырвонаму. Большасьцю 35 галасоў пры 5 — за й 20 паўстрымаўшыхся прапанова адкіненая й мандат нацыянальнага Кітаю зацьверджаны.

Палітычная камісія ЗН прыняла пастанову паводле якое становішча саюзнай дэлегацыі у справе замірэньня ў Панмуджоме ўважаецца правільным і прапануецца агульнай асамблеі зацьвердзіць яго. Пасьля выбараў, амэрыканская дэлегацыя мае ўнесьці прапанову аб памацненьні саюзных ваенных сілаў у Карэі. Прадбачыцца што будзе таксама ўнесеная прапанова адносна эканамічнага байкоту чырвонага Кітаю у выпадку, калі ён адмовіцца ад замірэньня.

29-га кастрычніка ў Задзіночаных Нацыях выступіўшы быў із вялікаю прамоваю Вышынскі. Прамова гэтая была, навет для палітыкаў з ЗН, якія прывыклі ужо да сваеасаблівых выступленьняў савецкіх „дыпляматаў", даволі сэнсацыйнаю.

Адказваючы на нядаўную прамову Эчысона, Вышынскі гаварыў больш трох з паловаю гадзінаў. Прамаўляючы, ён раз па разе паказваў на Эчысона пальцам, трос кулакамі й стукаў пясьцямі па стале. Атакуючы паасобныя часткі эчысонавае прамовы, Вышынскі абзываў яго ілгуном ды іншымі мала ўжыванымі ў дыпляматычным сьвеце словамі.

Ведама, што Вышынскі не забыўся лаяць дзе мага й увесь заходні сьвет, а асабліва ЗША, абвінавачваючы іх у катаваньні чырвоных палонных, бактарыялягічнай вайне й г.д.

Аднак, дарма што ўсе намаганьні, лаянка й вымахваньне кулакамі, прапанова Вышынскага ў дачыненьні да замірэньня ў Карэі не дала, па праўдзе, нічога новага й была адхіленая бальшынёю галасоў, як заўсёды.

КАРЭЯ

Чырвоныя й далей працягваюць зацятыя атакі на важнешыя стратэгічныя пункты, якія прыкрываюць Сэул з паўночнага ўсходу. Галоўныя зь іх гэта: „Траянгл Хілл", „Снайпэр Рыдж", „Пайк Пік", „Літтл Гібралтар Хілл", „Уайт Горс", „Айрон Горс", „Олд Болды", „Біг Норы" і інш. Усе яны, знаходзяцца на ўзгорках, таму наступ на іх каштуе шмат ахвяраў. Чырвоныя ўсьцяж кідаюць ў бой сьвежыя сілы, пакідаючы тысячы забітых і раненых, каб праз пару гадзінаў ізноў пачаць наступ. Таму вяршыні гэтыя часта пераходзяць з рук у рукі. У баёх прыймае ўдзел саюзнае лятунства якое спрычыняе вялікія шкоды ворагу. Начальнік штабу амэрыканскага ваеннага лятунства ген. Х. Вандэнбэрг заявіў кагадзе, што савецкімі зьнішчальнікамі МІГ-15 кіруюць ня толькі савецкія, але й нямецкія лётнікі. Гэта першае гэткае афіцыйнае амэрыканскае сьцьверджаньне.

НОВАЯ ПАЛІТЫКА

Д. Ф. Даллес, адзін з галоўных дарадчыкаў Айзэнгаўэра ў пытаньнях замежнае палітыкі, выступіў нядаўна з прамоваю, у якой, між іншым, заявіў, што неабходна нарэшце адмовіцца ад палітыкі ўціхаміраньня савецкае агрэсіі. Замест гэтага трэба ўсімі спосабамі дзеяць у кірунку вызваленьня ўсіх народаў, паняволеных Маскоўскім камунізмам. Праўда, Даллес успамінае тут таксама аб тым, што гэтую палітыку вызваленьня паняволеных народаў яны будуць старацца праводзіць „мірным" шляхам.

10-ыя угодкі УПА

У мінулую нядзелю 26-га кастрычніка ў залі Мэнгэттан Сэнтар у Нью-Ёрку адбыўся вялікі мітынг, прысьвечаны дзясятым угодкам Украінскае Паўстанчае Арміі (УПА) і ейнаму змаганьню із камуністычным панявольнікам Украіны.

На гэтым мітынгу амэрыканцы ўкраінскага паходжаньня асьветчылі аб сваім поўным подтрыманьні змаганьня ўкраінскага народу за вызваленьне з пад бальшавіцкае нявoлі й прыраклі сваю дапамогу як Украінскаму 40 мільённаму народу, гэтак і усім паняволеным народам Савецкага Саюзу.

Украінская Паўстанчая Армія (УПА), заснаваная дзесяць год таму, на працягу ўсіх гэтых год вяла й вядзе да сяньня нясупыннае змаганьне з панявольнікамі Украіны — маскоўскімі бальшавікамі.

На мітынгу прамаўлялі сэнатары Ірвінг Айвс і Тодар Грын, а таксама былыя афіцэры й жаўнеры УПА. Між імі была маладая дзяўчына, сябра УПА, якая толькі нядаўна ўцякла з за зялезнае заслоны з групаю паўстанцаў.

Присутныя на мітынгу тысячы прынялі адмысловую рэзалюцыю, якая, між іншага, зьвяртаецца да „ўсіх свабодных народаў сьвету й да ўсіх свабодалюбных нацыяў за зялезнай заслонай із заклікам задіночыць свае намаганьні, каб зрабіць канцы із палітычнай агрэсіяй Масквы, вызваляючы ейныя ахвяры".

ВАЙСКОЎЦЫ-БЕЛАРУСЫ

Надыйшоў месяц лістапад. Гэты месяц накіроўвае думкі кажнага вайскоўца-беларуса на падзеі ды чыны нашага збройнага змаганьня за незалежнасьць Радзімы-Беларусі, на ахвярнасьць для беларускае справы, на тых нашых герояў-змагароў, што із моцнай верай у перамогу пачалі сьмяротнае ходаньне з чужынцам-наезьнікам, які ймкнуўся паняволіць наш народ.

Дзень 27-га лістапада — гэта іхнае сьвята. Дзень гэты быў пачаткам збройнага чыну Случчакоў, што, як тыя волаты-асілкі з нашых казкаў, выйшлі на сустрач усходнім гордам, каб собскімі целамі запыніць іхны паход-наезд дзеля паняволеньня нашае Бацькаўшчыны.

Дзень гэты стаўся й днём ушанаваньня іхнае памяці, слаўнае памяці ўсіх беларускіх змагароў-герояў, што аддалі жыцьцё за незалежнасьць Беларускае Народнае Рэспублікі.

Гэткіх герояў мы мелі тысячы. Пэўне, маем мы іх і цяпер, і будзем мець заўсёды, аж пакуль Радзіма нашая ня скіне чужую няволю. Бо змаганьне за незалежнасьць ідзе й будзе йсьці ўсьцяж, сяньня, як ішло учора, заўтра — як сягоньня.

Рознымі шляхамі, аднак, даводзіцца йсьці да перамогі нашым змагаром.

Там, на бацькаўшчыне — пануе сяньня жахлівы тэрор. Жыхарства падсавецкае БССР, гэтае фікцыі нашага гаспадарства, ня сьмее ўзьняць галавы, сказаць слова супраць панявольніка. Але й там гуртуюцца па лясох няўстрашныя змагары за вызваленьне Беларусі — нашыя нацыянальныя партызаны, наносячы ворагу ўдары, калі й дзе толькі мага.

За межамі Радзімы змаганьне йдзе іншай дарогай. Тутка беларускія прадстаўнікі ходаюцца за нашую будучую незалежнасьць на палітычным полі, пераконваючы сьвет аб нашай праўдзе, навязваючы сувязі ды саюзы, падпісваючы умовы, абмяркоўваючы будучыя супольныя франты змаганьня.

Аднак, трэба памятаваць, што ўсе ўмовы, ўсе падпісаныя тым ці іншым прызнаньні нашае дзяржаўнасьці — ніколі не забясьпечаць незалежнасьці Беларускае Народнае Рэспублікі навет пасьля ўпадку камуністычнага рэжыму.

Калі глянуць назад, — можна прывесьці сотні прыкладаў неўшанаваньня старонамі падпісаных імі кагадзе ўмоваў. Умовы дзейнічаюць адно, пакуль гэта выгаднае тым, што іх падпісвалі. У міжнародных дачыненьнях вырашаюць тую ці іншую справу, папраўдзе, не яны, а зброя. І таму найбольш урачыста падпісаныя ўмовы, найразумнейшыя дыпляматычныя ходы забываюцца часта на працягу колькіх год, тады як збройныя чыны змагароў за нашую незалежнасьць памятуюцца з пакаленьня ў пакаленьне.

Кастусь Каліноўскі стаўся нашым нацыянальным героем толькі таму, што, імкнучыся вызваліць беларускі народ ад маскоўскае няволі, ён арганізаваў збройныя паўстаньні нашага народу.

Урад Беларускае Народнае Рэспублікі за часоў свае незалежнасьці падпісаў шмат умоваў з рознымі гаспадарствамі сьвету. Аднак, умовы гэтыя пасьля ўпадку нашае незалежнасьці апынуліся ў архівах і аб іх усе забыліся.

А збройны чын Случчыны з 27-га лістапада 1918 году стаўся нашым нацыянальным сьвятам, што ўжо гады натхняе беларускіх патрыётаў і будзе натхняць да чыну яшчэ не адно нашае пакаленьне.

Аб гэтай праўдзе ні адзін беларус не павінен забывацца, асабліва-ж нашыя вайскоўцы. Гарантыяй нашае незалежнасьці можа быць вылучна збройная сіла. Калі Беларускі народ патрапіць яе стварыць, — ён будзе напэўна незалежным.

Як і ў мінулыя гады, — гэтак і сёлета нашыя вайскоўцы не павінны забыцца аб сваіх сяброх-героях. Належна ўшаноўваючы іхную сьветлую памяць, мы будзем узвышаць гэтым свой дух, узмацьняць сваю волю да змаганьня й перамогі.

Бо мы мусім быць дужыя.

Дзень, калі нам давядзецца здаць лічбу із свайго гарту, свае наважанасьці, адвагі й адданасьці Бацькаўшчыне — набліжаецца.

Дык аддайма-ж чэсьць памяці тых, якія без засьцярогі **ўжо** ахвяравалі сваё жыцьцё Бацькаўшчыне, каб і нашую памяць маглі некалі ўшанаваць тыя, што будуць жыць і змагацца пасьля нас.

Няхай ніколі не загіне ў нашых сэрцах памяць слаўных змагароў за незалежнасьць нашае Радзімы!

Няхай жыве збройнае змаганьне за вызваленьне Беларускае Народнае Рэспублікі!

Жыве Беларусь!

Ген. Брыг. Ф. Кушэль

Нью-Ёрк, 1 лістапада 1952 г.

ДАМАГАНЬНІ ПРЫВІЛЕЯЎ

Спадар Нікалаеўскі, адзін з галоўных арганізатараў супольнага антыбальшавіцкага цэнтру народаў СССР з боку расейцаў (часта выглядае, што нават і з боку Амэрыканскага Камітэту!) надоячы, пасьля Штарнбэрскай нарады, апублікаваў артыкул, у якім адкрывае некаторыя далейшыя пляны што да спосабу арганізацыі гэтага цэнтру.

Сяньня хочам тут зьвярнуць увагу на адну справу: пагляд расейцаў на спосаб рэпрэзэнтацыі ў такім цэнтры паасобных нацыянальнасьцяў. Як выглядае з артыкулу Нікалаеўскага, у будучым цэнтры палова ўсіх прадстаўнікоў маюць быць расейцы. Другая палова пакідаецца ўсім іншым нацыянальнасьцям СССР.

Мы лічым гэткі спосаб рэпрэзэнтацыі, вельмі выгадны палітычна расейцам, неправільным і неадпаведным для такое міжнацыянальнае арганізацыі, якой мае быць антыбальшавіцкі цэнтар народаў СССР.

Паперашае, усе міжнародныя арганізацыі дагэтуль звычайна арганізуюцца й дзеюць на прынцыпе роўнасьці кажнага народу, незалежна ад ягонай вялічыні. Гэта, між іншым, і прынцып Атлянтычнай Хартыі.

Гэткі прынцып быў некалі асноваю дзейнасьці Лігі Нацыяў, такі прынцып ляжыць і ў васнове Злучаных Народаў. У ЗН ёсьць толькі адно адступленьне — права вэта для 5-цёх вялікіх дзяржаваў, якое было падуманае толькі як выняткавае мерапрыемства-адтуліна для нязвычайных выпадкаў, з якое адна [illegible] тычная дзяржава — Саветы — тарнуе з хранічнаю ўпорыстасьцяй, перачыкнуўшы ім ужо больш як паўсотню разоў пастановы бальшыні сяброў ЗН.

І ня толькі ў ЗН, але й ува ўсіх іншых выпадках міжнароднага сужыцьця кажныя перамовы звычайна вядуцца на прынцыпе роўнасьці кажнага народу-ўдзельніка, ці гэта будуць ЗША, ці малая Бэльгія. Іншая справа, што паза праўна-фармальнай роўнасьцяй, з голасам ЗША лічацца звычайна йнакш, чымся з голасам гэтайжа Бэльгіі, паколькі існуе значная розьніца ў эканамічным і палітычна-мілітарным патэнцыяле гэтых дзьвёх дзяржаваў. Аднак, ад прынцыпу праўнай роўнасьці кажнага народу дзеля гэтага ніхто не адступае.

Прапарцыянальнасьць ня ёсьць роўнасьцяй. Прынцып прапарцыянальнасьці ў шырокім ужыцьці у нутраным жыцьці паасобных народаў ад часоў заіснаваньня дэмакратычных ладаў. На аснове гэтага прынцыпу звычайна выбіраюцца розныя народныя прадстаўніцтвы, як парлямэнты, кангрэсы, соймы й г. д.

З таго, што расейцы намагаюцца правесьці прынцып прапарцыянальнасьці ў твораным цэнтры, відаць адразу, што яны лічаць гэтую арганізацыю не як запраўды міжнацыянальную, а як такую, што рэпрэзэнтуе адну дзяржаву. З гэтага гледзішча яны йдуць назад у кірунку „едінойнеделімой" нават і ў прыраўнаньні да бальшавікоў, якія свой „савет нацыянальнасьцяў" стварылі, згодна з міжнароднай традыцыяй, не на прынцыпе прапорцыі, а на прынцыпе роўнасьці кажнага народу. Там кажная рэспубліка, незалежна ад яе вялічыні, рэпрэзэнтуецца роўнай колькасьцяй прадстаўнікоў. Навет і аўтономным вобласьцям загвараантаванае прадстаўніцтва (хаця й меншае лічбова).

З гэтага бачым, што расейскія эміграцыйныя палітыкі й з гэтага боку намагаюцца значна павузіць правы народаў СССР з яўнаю выгадаю для аднаго адзінага народу — расейскага.

З другога боку, мусім зьвярнуць увагу й на тое, што й з гледзішча прапарцыянальнасьці, для

Дамаганьні прывілеяу

расейцаў 50% прыпадае толькі паводле афіцыйнай савецкай статыстыкі, якая зусім не адбівае запраўднага палажэньня. Хаця-б на нашым беларускім прыкладзе мы добра ведаем, што савецкая статыстыка далёкая ад праўды. Калі-б узяць даныя аб Беларусі не з савецкіх афіцыйных жаролаў, а із срога навуковых — навет і расейскіх! (напр. Дыялектолёгічная Камісія Імпэратарскай Акадэміі Навук з 1915 г., або дадзеныя расейскага вучонага Карскага) — дык колькасьць беларусаў узрасьце ўжо болей як на 50%. І гэта таму, што вялікія прасторы на ўсходзе Беларусі бальшавікі ўлучылі ў Расейскую СССР (напр. Смаленшчыну).

Гэткая самая справа і з іншымі народамі ды рэспублікамі СССР. Калі-б правесьці справядлівае аблічэньне не на аснове афіцыйных савецкіх дадзеных, а на падставе навуковых (навет і расейскіх) жаролаў, дык выявіцца, што ў СССР расейцаў менш чымся 40%, негаворачы ўжо аб 50%.

Здавалася-б, у справе рэпрэзэнтацыі паасобных народаў было-б найпрасьцей, згодна з прынятай на ўсім сьвеце традыцыяй, сказаць: давайце сядзем і будзем гаварыць аб сваіх супольных справах як роўны з роўным. Выглядае аднак, што расейскія палітыкі да гэтага аніяк ня могуць дайсьці. Яны ўсё шукаюць простых і крывых дарогаў і дарожак, каб забясьпечыць сабе прывілеяванае палажэньне імпэрскага „хаяіна" у дачыненьні да іншых нацыянальнасьцяў. Выглядае навет, што яны адчуваюць сабе проста й за крыўду, калі іншыя народы хочаць і гатовыя гаварыць зь імі як з роўнымі.

Што гэтак думаюць расейскія эміграцыйныя палітыкі — гэта нам не навіна, і гэта нас ня дзівіць. Горш тое, што ёсьць праявы таго, што й Амэрыканскі Камітэт ня трымаецца у гэтай справе правілаў міжнароднай дэмакратычнай традыцыі, а падтрымлівае дамаганьні расейцаў атрымаць для сябе такое лепшае становішча, якога ня мае нідзе на сьвеце ніякі іншы народ, якога ня мае ў дачыненьні іншых народаў — і недамагаецца сабе! — і амэрыканскі народ у палітычным міжнародным сужыцьці.

Б. Б-ч.

Беларусь і партыйныя кар'еры

Паводле Сталінскае канстытуцыі Беларусь лічыцца самастойнай, вольнай краінай. І напачатку, каб стварыць нейкае вонкавае уражаньне, камуністычная партыя вылучала ў „правадыры" БССР людзей або беларускага паходжаньня, або цесна із Беларусяй зьвязаных. Аднак, большыня гэткіх правадыроў ня толькі была неўзабаве адхіленая, але й заплаціла за свае высокія пасады сьмерцяй. Асабліва трагічны лёс спаткаў гэткіх ведамых беларускіх кіраўнікоў, як Галадзед (былы старшыня Саўнаркому Беларусі) і Чарвякоў (былы прэзыдэнт БССР). Абодвы яны заблыталіся ў тых непераможных процілежнасьцях, што сталі паміж іхнай беларускай натурай і нацыянальнымі беларускімі імкненьнямі, а бальшавіцкай запраўднасьцяй, якая ўзялася вырываць із карэньнем кажную запраўды беларускую думку. Кар'еры Галадзеда й Чарвякова каштавалі ім жыцьця, абодвы скончылі самагубствам, з той толькі розьніцай, што першы загінуў у Бутырскай турме, а другі пасьпеў зрабіць гэта ў собскай кватэры.

Гэткім чынам мэтад беларускага (як і інш.) нацыянальнага правадырства ня прынёс партыі жаданае карысьці й мусіў быць зьменены. Цэнтральны Камітэт бальшавікоў дадумаўся тады выкарыстаць тактыку вызначэньня „пасылкі правадыроў" у нацыянальныя рэспублікі, выбіраючы іх, звычайна, з паміж працаўнікоў свайго партыйнага апарату. Дзеля вонкавасьці, вызначанага ЦК кандыдата пасьля „выбіралі" (ведама, аднагалосна) на партыйных зьездах нацыянальных рэспублікаў, дзе, аднак, мясцовыя камуністыя баяліся нат слова сказаць супраць зусім ім нязнанага новага „правадыра". Гэты спосаб адразу-ж паказаўся пэўнейшым і больш надзейным, хоць і тутка здараліся іншы раз ня зусім прыемныя для Масквы неспадзяванкі.

Адным з гэткіх „выдвіжэнцаў" новае партыйнае тактыкі быў і былы „правадыр" БССР Панамарэнка, быццам украінец з паходжаньня, але на справе рэнэгат, што даўно прадаў душу за кар'еру, за цёплае месцейка бліжэй да праменьняў сталінскае ласкі.

Панамарэнка працаваў спачатку ў апараце ЦК і, відаць, нечым „праявіў" сябе, што яго наважылі пасаць на пасаду першага сакратара камуністычнае партыі Беларусі, (КПБ(б)). На партыйным зьезде ў Менску яго, ведама, урачыста „выбралі", хоць дагэтуль ніхто гэтта ня ведаў ні аб ім, ні аб ягонай дзейнасьці. І Панамарэнка пачаў „кіраваць". У ягонай асобе ЦК знайшоў асабліва вернага чалавека, можна сказаць, навет, асобу, што найбольш адказвала партыйнай сталінскай палітыцы. Бяспрынцыпны, цынік, халодны, бессардэчны чалавек, — ён гатовы быў зрабіць па загаду Сталіна найгоршае злачынства. Гэта яму, Панамарэнку Беларусь можа дзякаваць за апошнія вынішчэньні беларускіх нацыянальных сілаў, за зацятую русыфікацыю й канчальнае падпарадкаваньне БССР Маскве. Кіруючы Беларусяй, Панамарэнка ані разу, навет для вока, ня лічыў патрэбным сказаць хоць слова пабеларуску. Наадварот, ён цалкам перабудаваў на расейскі лад і ЦК Беларусі й Саўнарком ды іншыя ўстановы. За ягоных часоў навет беларускія пісьменьнікі й настаўнікі баяліся гаварыць роднай мовай, калі гэтага ня вымагала прапаганда.

Ясна, што ўсё гэта залічалася Панамарэнку ў Маскве як „дасягненьні". Асабліва-ж вызначыўся Панамарэнка ў пару падпісаньня савецка-гітлераўскага пакту, у часе „вызваленьня" войскамі беларускае (на самай справе вылучна расейскае) ваеннае акругі Заходняе Беларусі, калі Панамарэнка, як сябра Рэвалюцыйнага Вайсковага Савету граў выдатную ролю галоўнага „вызвольніка". Гэта ён здушыў нацыянальны рух Заходняе Беларусі, выслаў на выгнаньне й сьмерць ейных дзеячоў і прыхільнікаў, чым сам ці раз цынічна хваліўся.

Калі пачалася вайна з Гітлерам, Панамарэнка адным з першых, цалкам забыўшыся на „свой народ", уцёк з Менску, із коптырам наладаваўшы сваю аўтамашыну каштоўнаю маемасьцяй. Праз нейкі час у „Праўдзе" зьявіўся ягоны артыкул, дзе ён афіцыйна паведамляў аб „сваечаснай і плянавай эвакуацыі Беларусі" і сьцьвярджаў, што там засталіся адно зраднікі й шпікі, „борагі народу", якіх „усюдых знойдзе караючая рука савецкае улады". Гэтае асьветчаньне „правадыра" Беларусі, кіненей ім на ласку й няласку Гітлера, было належна ацэненае й зразумелае жыхарствам Беларусі. Яно пабачыла, што гэткае хлусьні, гэткага нахабства не „дасягнуў" дагэтуль ніхто з „ейных" кіраўнікоў.

Сталіну, аднак, гэта было й па душы й на руку. Панамарэнку ня толькі не ўзялі „на мушку" за ягоныя ўцекі з пасту, але узнагародзілі высокаю пасадаю ў партызанскім штабе, надаючы годнасьць савецкага генерала, хоць Панамарэнка вайскоўцам і ны быў.

Калі вайна скончылася, Панамарэнку ізноў накіравалі ў Беларусь, як ейнага „вызвольніка" ад фашыстаў. І гэты цынік зусім ня стыдаўся глядзець у вочы тым, каго ён так паскудна зрадзіў. Дзякуючы сталінскай ласцы ён стаўся „царом і богам" нешчасьлівае, зруйнаванае фізычна й духова краіны, спалучаючы разам і партыйнае (сакратар ЦК Беларусі) й адміністрацыйнае (старшыня Саўнаркому, а пасьля старшыня рады міністраў) правадырства, зусім як меншага памеру Сталін, што гэтаксама ўзначальваў і партыю й дзяржаву. Новую годнасьць атрымаў Панамарэнка й па вайсковай лініі. Яго зрабілі генэрал-лэйтэнантам, што ізноў крыху нагадвала „генэраліссімуса".

(Канец на 4-ай бал.)

ЗЬМЕНЫ Ў ФОРДАУСКІМ ФОНДЗЕ УСХОДНЯЕ ЭЎРОПЫ

Данальд А. Лоўры, які паклікаты днямі на дырэктара Фонду Усходняе Эўропы на месца Мэльвіля Ж. Рагльса, паведамляе аб зьменах у працы Фонду на будучыню.

У мінулым годзе, піша ён, Фонд у бальшыні выпадкаў дапамагаў арганізацыям, закладзеным тутка самымі ўцекачамі з Савецкага Саюзу. У надыходзячым годзе, галоўная увага Фонду будзе адданая арганізацыям, якія даўгі час працуюць у галіне сацыяльнае дапамогі і зацікаўленыя ў супрацоўніцтве з эміграцыяй.

Сп. Данальд Лоўры стары працаўнік арганізацыі УМСА.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

Віцэ-адмірал Лэсьлі К Стывэнс, старшыня Амэрыканскага Камітэту Вызваленьня, паведамляе нас, што ў склад ягонага камітэту увайшлі кагадзе чатыры новыя сябры — генэрал-майор Джон Р. Дын, адмірал Джордж Мэнц, сп. Мікола Рузвэльт і сп. Піліп Уілкі.

Ген. Дын, у сваёй даўгой службе ў амэрыканскай арміі, пабываў і ў Кітаі, і ў Панаме, а ў 1943-45 гадох займаў высокую пасаду Шэфа Амэрыканскае Вайсковае Місіі. Ён ёсьць аўтарам добра ведамае кнігі — „Дзіўны Саюз", дзе ён апісвае амэрыканска-савецкія дачыненьні у часе вайны. За вылучныя паслугі для дзяржавы, ген. Дын узнагароджаны колькімі вызначэньнямі.

Кар'ера **адмірала Мэнца,** як і служба ген. Дына, была багатая ў дазнаньні ў галіне замежных справаў. Скончыўшы Амэрыканскую Марскую Акадэмію, адмірал Мэнц зьведаў усе куткі і ўсе акіяны сьвету. У гадох 1947-50 ён быў шэфам Міжнароднае Арганізацыі для Уцекачоў у Італіі, за што й атрымаў ад папы Пія XII й італьянскага ураду колькі ўзнагародаў, як ордэн сьв. Юр'я і ордэн Салідарнасьці першае клясы. Шматлікія ўцекачы-ДП, якім ён столькі дапамог, будучы ў службе IPO ў Італіі, таксама добра яго ўспамінаюць, бо дзякуючы якраз яму, ім удалося пазьбегнуць прымусовай рэпатрыяцыі ў Савецкі Саюз.

Трэці новы сябра Камітэту — **Мікола Рузвэльт** адначасна й пісьменьнік, і дыплямат і спэцыялісты ў замежных справах. Пасьля дыплёматычнае службы ў Францыі ды Мадрыце, М. Рузвэльт быў накіраваны на Філіпіны як Віцэ-Губэрнатар абтокаў, а паміж 1930-33 г. ён быў паслом ЗША у Вугоршчыне. У часе вайны ён працаваў у Бюро Ваеннае Інфармацыі, будучы адначасна супрацоўнікам шмат якіх больших газэтаў у Вене, Парыжы й Газе. У 1944 годзе ён быў паклікаты заступнікам радактара газэты „Нью-Ёрк Таймс".

Сп. **Піліп Уілкі,** сын ведамага дзяржаўнага дзеяча, пісьменьніка Вэндэля Уілкі, — па прафэсіі праўнік. Ён скончыў унівэрсытэт у Гарвардзе й Калюмбіі. Ад 1948 году ён бярэ чынны ўдзел у палітычным жыцьці ЗША як заступнік старшыні рэспубліканскага нацыянальнага сэнацкага камітэту ў гадох 1949-50 і га-

Беларуска-Літоуская Дывізыя

Улетку 1918 году, пасьля капітуляцыі Нямеччыны, згодна із пастауленымі саюзнымі дзяржавамі умовамі капітуляцыі, нямецкая армія пачала адступаць, пакідаючы акупаваныя ёю на працягу колькіх год прасторы на ўсходзе. Гэткім чынам, улетку 1918 году сталася вольнай і прастора Беларускае Народнае Рэспублікі, займаная дагэтуль нямецкім акупантам.

Як толькі апошнія нямецкія жаўнеры пакінулі беларускія землі, урад БНР адразу-ж прыступіў да арганізацыі свайго дзяржаўнага апарату. Як у сталіцы БНР Менску, гэтак і на правінцы закіпела жыцьцё й пачалася дружная праца будаваньня сваіх беларускіх установаў, наладжаньне школьніцтва, мабілізацыя рук, ахвочых ды здатных да працы. Здавалася, што надыйшла нарэшце тая пара, якое столькі год чакаў беларускі народ, пара, аб якой пісалі й лятуцелі беларускія пісьменьнікі й паэты, за якую змагаліся нашыя палітыкі й змагары, час волі й дзяржаўнае незалежнасьці.

Аднак, гэтым поўным творчага натхненьня дням ня суджанае было трываць доўга, дарма што рук да працы было досыць, а ахвоты яшчэ больш. Ледзь пасьпелі самыя глухія куткі нашае бацькаўшчыны увядць сабе ўсё значаньне свабоды ад усялякіх акупантаў, як бальшавікі, што пільна сачылі за намі з за нашых усходніх межаў, зразумелі палажэньне й пачалі гарачкова здыймаць вайсковыя адзінкі із сваіх белаармейскіх франтоў, накіроўваючы іх на Захад.

Сьпяшаючыся рабіць гэта, крамлёўскія ўлады мелі на мэце зьнішчыць адным ударам і маладую дэмакратычную Беларусь, што толькі пачала наладжваць сваё незалежнае жыцьцё, разьбіць проці-бальшавіцка настроеную Польшу ды палучыцца зь нямецкімі камуністымі, якія якраз узьнялі чырвоныя сьцягі камуністычнага перавароту ў Нямеччыне, змагаючыся за ўладу й перамогу. Падзеі гэтыя здаваліся шмат каму ў тыя часы пачаткам сусьветнае рэвалюцыі, аб якой весьціў гэтак урачыста словы камуністычнага інтэрнацыяналу. І ня дзіва, што босыя, ды сагрэтыя надзеяй жаўнеры савятау, спрытна кіраваныя партыяй, рынулі на Захад.

Маладая незалежная Беларуская Рэспубліка, якая толькі пачынала станавіцца на ногі й ня мела яшчэ войска, якое магло-б даць належны адпор гордам з усходу, была ў хуткім часе залітая масай чырвонае арміі.

Аднак, на мяжы із этнаграфічнай Польшчай бальшавіцкія аддзелы былі спыненыя польскай арміяй, якая была ў тыя часы хоць таксама маладая, але значна лепш узброеная, чымся войска БНР, якое было, па праўдзе, адно ў пачаткавым стане арганізацыі.

Да таго-ж польская армія мела вялікую дапамогу ад саюзьнікаў — Ангельшчыны ды Францыі, якія, напалоханыя магчымасьцяй палучэньня нямецкіх камуністых із расейскай камуністычнай арміяй, пачалі слаць у Польшчу й зброю й навет вайсковых дарадчыкаў.

Гэтак, на тыя часы, польская армія сталася арміяй зусім баяздольнай і магла ўжо бараніць сваю нядаўна здабытую незалежнасьць.

Разгарэлася польска-бальшавіцкая вайна. Хутка пасьля першых сутычкаў, палякі патрапілі атрымаць над бальшавікамі перавагу й пачалі адсоўваць іх штораз далей на ўсход, перайшоўшы блізу на ўсім фронце ў процінаступ.

Змаганьне трывала каля году й пад канец 1919 году польская армія дайшла да ракі Бярэзіны, дзе й спынілася. Вялікая частка беларускае прасторы апынулася пад новай акупацыяй, акупацыяй польскай.

Але, па праўдзе, заняўшы гэткую вялізарную, як на іхныя вайсковыя магчымасьці прастору, палякі знайшліся ў досыць цяжкім палажэньні. І вось, дайшоўшы да Вільні, якую бальшавікі пакінулі паляком блізу без аднаго стрэлу, начальнік польскае дзяржавы й галоўнакамандуючы арміяй Язэп Пілсудскі выдаў да „жыхароў былога Вялікага Княства Літоўскага", як у ёй гаварылася, адмысловую адозву. У адозве гэтай Пілсудскі, між іншым, пісаў гэтак:

— „Польская армія здабыла прасторы былога Вялікага Княства Літоўскага, каб даць магчымасьць усім народам гэтага краю самым вырашыць свой собскі лёс"...

А калі польская армія заняла Менск, яна ня толькі не перашкодзіла Радзе БНР склікаць тамака сваю сэсію, але й паставілася да яе, быццам, зусім прыхільна.

Гэта не перашкодзіла, аднак, Варшаўскаму ураду вызначыць неўзабаве свайго генэральнага камісара на занятыя беларускія прасторы, як цывільную польскую уладу Беларусі.

Сьпярша, пасьля бальшавіцкага тэрору, хаосу й голаду, польская акупацыя паказалася шмат каму досыць лагоднай. Прыхільныя навонкі дачыненьні палякаў да нашага народу, а асабліва ўспомненая ўжо адозва Пілсудзкага садзейнічалі таму, што некаторыя беларускія дзеячы пачалі навет спадзявацца магчымасьці дагаварыцца з польскім урадам у беларускай справе.

Пачаліся першыя крокі да зьдзейсьненьня гэткіх магчымасьцяў.

Арганізаваная пры Віленскім беларускім нацыянальным камітеце г. зв. Беларуская Вайсковая Камісія злажыла мэмарыял галаве польскае дзяржавы Пілсудзкаму, у якім прасіла яго дазволіць на арганізацыю беларускага войска дзеля супольнага змаганьня із чырвоным захопнікам з Усходу. Мэмарыял гэты быў прыняты Пілсудзкім прыхільна. Нашым прадстаўнікам было навет прыабяцанае, што неўзабаве будзе выданы адмысловы дэкрэт, на моцы якога беларусам будзе дазволенае арганізаваць свае вайсковыя аддзелы.

Як ужо ўспаміналася вышэй, вайна Польшчы із Савецкім Саюзам, якая вялася на шырокім фронце, патрабавала вялікае арміі. Людзкія-ж рэзэрвы былі ў палякаў, параўнальна, невялікія. Паводле Вэрсальскіх пастановаў, польскай мяжой на ўсходзе была вызначаная г. зв. лінія Кэрзона, якая ляжала крыху на ўсход ад этнаграфічнае польскае мяжы. Прастора на захад ад лініі Кэрзона, аж да ўстаноўленых межаў польскага гаспадарства на захадзе — і ўважалася за прастору Незалежнае Польскае рэспублікі. На гэтым абшары палякі былі правеўшы мабілізацыю, але яна не магла даць польскаму ўраду дастаткова вялікую й магутную армію, што была-б здольная да доўгога й пераможнага змаганьня з нявычэрпнымі людзкімі рэзэрвамі чырвонае арміі бальшавікоў.

Тым часам, вялікая прастора акупаваных польскімі войскамі беларускіх земляў была багатая людзьмі, здольнымі да ўсіх цяжкасьцяў вайсковае службы. Бо, як ведама з гісторыі, беларускія жаўнеры здаўна славіліся вытрымаласьцяй і баяздольнасьцяй. Людзі гэтыя былі часткава жаўнерамі былое царскае арміі, што папрыходзілі кагадзе да хаты „з вайны", а таксама моладзь, якая праўда, яшчэ ня была ні ў якой арміі, але хацела йсьці ў войска, бачачы ў вайсковай службе нешта нязвычайнае й рамантычнае, чаго яны ня мелі ў штодзённасьці сваіх глухіх вёскаў. Да таго-ж, яны спадзяваліся змагацца ў сваім войску й за сваю справу проці зьненавіджаных бальшавікоў, якіх яны зусім правільна спалучалі ў адно наагул з расейцамі, што даўгія гады панявалі Беларусь.

Моладзь гэтая, а таксама й шмат хто з нядаўных жаўнераў толькі й чакалі нагоды, каб із зброяй у руках падужацца з бальшавікамі.

Пакуса была завялікая й ня выкарыстаць яе палякі не маглі.

Сьпярша яны абвесьцілі набор ахвотнікаў у польскую армію, але гэткіх паміж беларусаў знайшлося вельмі мала. Прымусам браць беларусаў у войска, правеўшы на прасторах акупаванае Беларусі мабілізацыю — польскі ўрад ня мог таксама, бо якраз у гэтым часе адбывалася Вэрсальская канфэрэнцыя і ў Парыжы былі прадстаўнікі БНР, якія пільна сачылі за тым, каб акупацыйныя ўлады, што займалі Беларусь, не рабілі нічога непрадугледжанага міжнароднымі правіламі ці пастановамі.

Тымчасам, чутка аб тым, што Беларуская Вайсковая Камісія злажыла на рукі галавы польскае дзяржавы Пілсудскага мэмарыял у справе арганізацыі беларускага войска, пранікла ў беларускія масы. У сэрцах шмат каго нарадзі-

Пачатак беларускае прэсы

Гісторыя беларускае прэсы дагэтуль блізу зусім недасьледжаная і найменш апрацаваная галіна беларускае слаўнае культуры. Таму беларускае грамадзтва памылкова лічыць пачаткам беларускае прэсы толькі 1862 год, калі зьявілася і шырака распаўсюджывалася на Бацькаўшчыне ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ДРУКАВАНАЯ ГАЗЭТА „МУЖЫЦКАЯ ПРАЎДА" рэдагаваная Кастусём Каліноўскім, ведамым „дыктатарам Літвы й Беларусі".

Кажны дасьледчык беларускага друку наагул і гісторыі беларускае прэсы асабліва, выразна убачыць, што пачатак беларускае прэсы сягае амаль на 300 год назад у нашай гісторыі, бо

ПАЧАТКАМ БЕЛАРУСКАЕ ПРЭСЫ ЁСЬЦЬ 1573 ГОД,

калі быў складзены першы ліст г. зв. „ОДПІСАЎ" Філона Кміты. ФІЛОН КМІТА, будучы старастам на ўзьмежку беларускае зямлі ў Воршы й Смаленску, выконваў там цяжкую службу вартаўніка паўночна-ўсходніх межаў Беларусі, якія заўсёды знаходзіліся пад пагрозаю маскоўскага нападу. Вось там, у Смаленску — першай гістарычнай сталіцы Крывічоў, Філон Кміта зарганізаваў даволі шырокую сетку зьвесткавае службы. Пры вельмі спрытна й як на той час добра зарганізаванай і хуткай сытэме, Кміта меў сваіх дапішчыкаў-„шпегаў" ня толькі па ўсім узьмежжы беларускае зямлі, але таксама ў Маскоўшчыне і навет у Польшчы, якая тады была фэдэратыўна зьвязанаю з нашаю Бацькаўшчынаю. Магчыма некаму зажадаецца назваць гэтую арганізаваную Філонам Кмітам ПЕРШУЮ ЗЬВЕСТКАВУЮ СЛУЖБУ БЕЛАРУСКУЮ — шпігунствам, як гэта ўжо і спрабавалі „гісторыкі" небеларусы, але гэта зусім не пярэчыць нашым цьверджаньням, , адно сьцьверджае і падмацоўвае нашую тэзу. Уся дзейнасьць кажнага дапішчыка і кажнае інфармацыйнае сучаснае прэсавае службы зьяўляецца адначасна і пераканаўчым падмацаваньнем вышэйсказанага аб дзейнасьці й працы. Першае Беларускае Зьвесткавае Службы Філона Кміты.

З весткаў ад сваіх людзёў Ф. Кміта добра ведаў палітычнае і гаспадарчае становішча ня толькі Беларусі, але й Маскоўшчыны і нават Польшчы. Вось гэтыя сабраныя зьвесткі Кміта **сыстэматычна** й старанна адпісваў і перапісваў ды перасылаў у Дзяржаўную Раду — „паном радным" — свае ПАВЕДАМЛЕНЬНІ і ВЕСТКІ, або як сам Кміта называў іх „ОДПІСЫ".

У „Одписах" зьмяшчаліся важныя й патрэбныя зьвесткі аб беларускай і замежнай палітыцы. Трапляюцца там весткі навет аб дачыненьнях маскоўцаў да перакопскіх татараў, аб нарадах маскоўскага князя із сваімі баярамі, аб урадках ў Маскоўшчыне і інш. За шчырую, патрыятычную працу дзеля дабра і славы Бацькаўшчыны, за паслугі адданыя беларускаму гаспадарству, Кміта быў узнагароджаны сэнатарствам з тытулам СМАЛЕНСКАГА ВАЯВОДЫ. Як абаронца незалежнасьці беларускага гаспадарства Філон Кміта ужо ўвайшоў у гісторыю нашае Бацькаўшчыны, але як першы арганізатар беларускае зьвесткавае службы, як пачынальнік беларускае прэсы — ён увойдзе і ў гісторыю беларускае прэсы й нашае слаўнае старое культуры.

ОДПІСЫ праіснавалі на працягу блізу двох год 1573 — 1574 і ўсяго пакуль ведамыя 31 нумары захаваныя да нашых дзён. Да захопу ў Маскоўшчыне ўлады бальшавікамі ОДПІСЫ перахоўваліся ў бібліятэцы Дэпартамэнту Расейскага Генэральнага Штабу ў Петраградзе, а пасьля гэтага былі пераданыя ў сакрэтны аддзел аднага з архіваў Ленінграду. Доступ да іх, відаць, зачынены, бо дагэтуль ніводзін з дасьледчыкаў беларускае культуры ў БССР, дзе пэўне-ж павінны былі-б імі зацікавіцца, навет не ўспамінае.

Дакладны назоў Одписаў:

РЕИСТРЪ СПИСАНЬЯ ТАРМЕНЪ, КОТОРЫЕ ЕСМИ ЛИСТЫ ЧЕРЕЗЪ ПОСЛАНЦЫ МОИ, ДАЮЧЫ ВЕДОМОСТЬ О КНЯЗИ ВЕЛИКОМ И О НОВИНАХ, О КОТОРЫХ МНЕ ШПЕГИ МОИ ЗЪ ЗЕМЛИ ЕГО НЕПРІЯТЕЛЬСКОЙ МОСКОВСКОЙ ВЕДАТИ ДАВАЛИ...

(Загаловак падаецца паводле Е. Карскага).

Хай нас не палохае, як гаварылася ўжо вышэй, ні даугі назоў, ні спатыканае ў ім слова „шпегі". Гэта поўнасьцю зразумелае і ў тую пару першых крокаў прэсавае зьвесткавае службы, ня толькі ў нас на Бацькаўшчыне, але й на Захадзе — аб усходзе (Маскоўшчыне) наагул ніякай гутаркі й быць не можа — інакш назваць дапішчыка, пры тагачасным багацьці старадаўняга беларускага лексыкону, зразумела, і не маглі. Калі мы зірнем у гісторыю прэсы Захаду, дык пабачым тыя самы праявы, а таму мы супакойна можам лічыць адпісы Кміты першым беларускім часапісам.

Што-ж тычыцца адсутнасьці прынятае сяньня ў кажным пэрыядычным выданьні парадкавае нумарацыі ці формы, дык гэта наагул не падлягае дыскусіі. Калі мы параўнаем з ОДПІСАМІ першыя газэты на захадзе Эўропы, дык пабачым навет некаторую перавагу й лепшую дасканаласьць нашых Одпісаў. Для прыкладу ўспомню першыя нямецкія газэты або першую газэту Прагі.

Гэткае-ж зьявішча знайходзім і ў гісторыі ангельскае прэсы, аб чым шырэй затрымліваюся ў маёй працы па гісторыі ангельскай прэсы, якая друкавалася ў органе СБЖ „Вольным Слове" (гл. №№ 7-15).


ОДПІСЫ гэта дакуманты з гісторыі Беларусі, з гісторыі беларускае культуры ды гісторыі беларускае прэсы, якія характарызуюць ня толькі нашае грамадзянства XVI стагодзьдзя й нашыя тагачасныя палітычныя суадносіны з суседзямі, але вельмі шмат даюць і для характарыстыкі Маскоўшчыны ды Польшчы. Гэта — жаролы нашае старадаўняе культуры, якія хаваюцца нашымі ворагамі ад нашых дасьледчыкаў, й таму няведамыя шырэйшаму грамадзтву. Апрача гэтага першараднага значаньня для гісторыі беларускае прэсы, ОДПІСЫ маюць таксама літаратурна-навуковую вартасьць, асабліва для мовазнаўцаў. Гэта не сухія весткі, але цікавыя і вобразна-жывыя пераказы паведамленьняў дапішчыкаў-„шпегаў", купцоў, перабежчыкаў і інш. людзей. Моваведам ОДПІСЫ цікавы будуць тым, што на іх можна будзе лёгка й дакладна прасачыць некаторыя ўплывы маскоўскае гаворкі на людзёў, якія карацей ці даўжэй жылі ў Маскоўшчыне і наадварот, як і пакіненыя імі нашыя ўплывы на маскоўскую гаворку.

Асабліва-ж павучальным і карысным будуць дасьледаваньні ОДПІСАЎ для выдаўцаў нашых часапісаў, бо там яны знойдуць шмат цікавых узораў, хоць бы дзеля ўжываньня як загалоўкі пэрлаў нашае народнае мудрасьці — прыказак, якімі Одпісы асабліва багатыя. Для прыкладу падам тут колькі гэткіх загалоўкаў: „Як даробіць ліха, прарэжуцца й зубы", „Ні думалі, ні гадалі, — гаспадарам нарадзілі", „Калі ўтапілі, тапор давалі, а выплыўшы — ні тапарышча", „Тая баба надвае варажыла" і шмат інш. Як бачым, усе яны й сяньня жывыя ў нашым народзе, да таго-ж вельмі надаюцца і дзеля загалоўкаў да артыкулаў аб нашай эміграцыйнай сучаснасьці, якія часам маюць зусім неапрацаваныя і нудныя загалоўкі.

Беларускае грамадзтва на эміграцыі будзе ў наступным годзе абыходзіць спалучаныя ўгодкі ПЕРШАЕ БЕЛАРУСКАЕ ГАЗЭТЫ „МУЖЫЦКАЯ ПРАЎДА" і 380-тыя ўгодкі беларускае прэсы ды спадзяецца да таго часу атрымаць ад нашых гісторыкаў і выдаўцаў вялікшых працаў як аб аднэй, гэтак і другой. Зацікавіцца гэтымі тэмамі абавязак і нашых навуковых інстытуцыяў на эміграцыі, і Саюзу Беларускіх Журналістых.

М. Вольны

ХАРАСТВО БЕЛАРУСІ



Над Нарачанскімі далечамі

ІРАН — АНГЕЛЬШЧЫНА

Іранскі пасол у Лёндане М. Х. Давалу афіцыяльна паведаміў ангельскі ўрад аб разрыве дыпляматычных дачыненьняў. Шэф іранскага ўраду Масадык ужо колькі дзён перад гэтым афіцыйна абвесьціў аб гэтым самым. Падставаю гэтае пастановы, заявіў Масадык, ёсьць адмова Ангельшчыны заплаціць за вялікія шкоды, спрычыненыя Ірану ангельскаю эканамічнаю блякадаю.

Блізу аднвчасна савецкі пасол у Тэгеране склаў свой пратэст у сувязі з тым, што, быццам, у паўночныя правінцыі Ірану пачаўся кантрабандны ўвоз усялякае зброі.

лася надзея ўступіць неўзабаве ў шэрагі беларускае арміі. Надзея гэтая ўсьцяж мацнела. Моладзь па вёсках толькі й гутарыла, што аб сваім войску.

Аб гэткіх настроях беларускага жыхарства, ведама, не маглі не дачуцца палякі. І вось, тут яны й наважылі пайсьці ў дачыненьні да акупаванага імі народу на запраўднае ашуканства. Ашуканства гэтае вельмі дапамагло памацненьню польскае арміі, але не прынясло нічога, апрача шкоды, для беларускае справы.

Сталася гэта вельмі проста:

Улетку 1919 году, у ўсіх местах, мястэчках, а навет вёсках Беларусі зьявіліся аднаго дня абвесткі аб наборы ахвотнікаў у „Беларуска - Літоўскую, Дывізыю", якая пачала якраз тварыцца.

Абвешчаньне гэтае, дарма што нашыя людзі даўно гэтага чакалі й спадзяваліся, стряснула краем, як удар пяруна. Тысячы людзёў, пераважна моладзі, не спадзяючыся ніякага зману, із радасьцяй накіраваліся ў найбліжэйшыя вярбунковыя установы, каб пажаўнерску паслужыць радзіме-Беларусі. Урадаўцы ледзь давалі рады запісваць ахвотнікаў і высылаць іх у зборныя пункты. Мо' хто зь іх і дзівіўся паціху гэткаму незразумеламу для іх захапленьню нашае моладзі чужою для іх па праўдзе вайсковаю справай, — ды беларускае жыхарства ні часіны не сумлявалася ў справядлівасьці справы, бо на першы вагонь запраўды здавалася, што гэта самы беларусы арганізуюць собскую Беларускую Дывізыю. Навет усе палкі атрымалі свае, мясцовыя назвы: былі створаныя полк Менскі, Слуцкі, Пінскі, Слонімскі, Наваградзкі, Лідзкі, Віленскі, Горадзенскі й Ковенскі.

Толькі той, хто добра знаўся на ўсіх палітычных хітрыках сьвету мог у тую пару ўцяміць, што запраўды хавалася пад назвай „Беларуска-Літоўская Дывізыя" й пакуль людзі дазналіся праўды, была створаная не адна, а па колькасьці палкоў колькі дывізыяў, што станавілі адну вельмі моцную апэрацыйную групу, знаную пад назвай Беларуска-Літоўскай Дывізыі аж да канца польска-бальшавіцкае вайны.

22-га кастрычніка 1919 году арганізацыя „Беларуска-Літоўскай Дывізыі" была скончаная.

І вось тады толькі быў абвешчаны дэкрэт галоўнакамандуючым польскай арміяй, Язэпам Пілсудзкім аб дазволе, дадзеным Беларускай Вайсковай Камісіі арганізаваць беларускія вайсковыя аддзелы (**Bialoruskie Oddzialy Narodowe**), на прынцыпе ахвотніцкага зацягу!

Што-ж па праўдзе прадстаўляла зь сябе г. зв. Беларуска-Літоўская Дывізыя пасьля скончанае арганізацыі?

Афіцэрскі склад ейны быў вылучна польскі, падафіцэрскі — польскі на 70%, а рэшта — беларускі, жаўнеры-ж былі на 95% чыстыя беларусы. У гэткім складзе гэтая дывізыя згуляла ў польска-бальшавіцкай вайне нязвычайна карысную для палякаў ролю.

Якраз яна вырашала аб перамозе у ўсіх цяжэйшых баёх.

У ліпені 1920 году палажэньне на фронце польска-бальшавіцкага змаганьня зьмянілася. Бальшавікі павялі новы вялікі наступ на польскую армію на прасторах Беларусі. Ня вытрымаўшы напору бальшавіцкае хвалі, польская армія пачала адступаць. Дзеля прыкрыцьця адступленьня была вызначаная Беларуска-Літоўская Дывізыя.

Гэткім чынам ёй давялося адыходзіць на захад ад Бярэзіны аж пад самую Варшаву у нясупынных жорсткіх баёх.

Варта затрымацца гэтта хоць коратка на ваенным палажэньні абодвух старонаў.

Крамлёўскі ўрад, якому пагражала небясьпека і з усходу, і з паўдня наважыўшы быў сабрацца із сіламі й скончыць урэшце рэштаў із Польшчай, каб мець вольныя рукі дзеля расправы із сваімі варагамі — белымі арміямі. Сабраўшы вялізарную армію абарваных і галодных байцоў пад камандай ведамага маршала Тухачэўскага, бальшавікі хацелі адным ударам нанесьці Пальшчы сьмяротную паразу — здабыць Варшаву. Яны разьлічвалі, што здабыцьцё Варшавы зломіць з аднаго боку Польшчу духова, з другога —правільна спадзяваліся зрабіць гэтым вялікае ўражаньне на Заходнюю Эўропу. Таму, прарваўшы фронт, Тухачэўскі бяз вогляду рынуў прост на Варшаву.

Палякі апынуліся у безнадзейным блізу палажэньні. Аднак, польскі генэральны штаб займеў стратэгічную думку, якая пазьней знайшла адзначэньне ў працах ваенных гісторыкаў — гэта ідэю зьвязаць чырвоную армію пад Варшавай, удараючы галоўнымі сіламі польскага войска на левае крыло арміі Тухачэўскага з паўдня, з раёну Дэмбліна.

Для зьвязаньня ворага, прасьцей кажучы дзеля абароны Варшавы, была вызначана Беларуска-Літоўская Дывізыя. Ускладзенае на яе важкое заданьне дывізыя выканала запраўды гераічна. На працягу колькіх дзён яна зь вялікай удачай адбівала роспачныя масавыя атакі чырвонае арміі ,не зважаючы ня вялізарныя страты ў людзях і трымаючы фронт пакуль ня быў выкананы ўспамінаны ўжо манэўр палякаў на левае крыло бальшавікоў, які, як ведама, разьбіў удрыз савецкую армію. Бітву гэтую палякі назвалі „Цудам над Віслай", не ўспамінаючы аднак, што да цуду гэтага ў вялікай меры прычыніліся й нашыя беларускія жаўнеры.

У мясцовасьці Радзымін недалёка Варшавы на палёх раскіданыя капцы брацкіх магілаў. Над магіламі гэтымі ўзвышаецца вялікі памятнік, на якім напісана:

„Гераічным абароньнікам Варшавы".

Ня шмат хто ведае, што ў гэтых брацкіх магілах тлеюць у бальшыні беларускія косьці, якія былі зложаныя гэтта каб ратаваць Польшчу ад бальшавіцкага ярма яшчэ ў 1920 годзе.

Пасьля вялізарнае паразы бальшавіцкае арміі пад Варшавай, Крамлёўскі ўрад быў прымушаны пайсьці на замірэньне з палякамі.

У кастрычніку 1920 году былі выпрацаваныя ўмовы замірэньня й ваенныя дзеяньні між старонамі спыніліся. Пачалася мірная канфэрэнцыя ў Рызе.

Варожыя бакі памірыліся коштам Беларускае Народнае Рэспублікі. Жывое цела Беларусі парэзалася на часткі й тымі, што гэтак нядаўна урачыстымі адозвамі абвяшчалі: „за нашую й вашую вольнасьць" і тымі, што крычэлі ў прапагандным запале „нясем свабоду народам"!

Выйгралі вайну палякі.

Але Рыскі мір ня вырашыў аднае справы, якая не давала супакойна спаць польскаму ўраду — справы Вільні й Віленшчыны.

Бо ў пару, калі польская армія адступала на Захад, апынуўшыся аж пад Варшавай, Вільню й частку Віленшчыны занялі летувісы. Сьпярша польскі ўрад быў навет задаволены з гэтага, спадзяючыся, што заняцьце Віленшчыны летувісамі спрычыніцца да выбуху вайны паміж Летувай і бальшавікамі, якая зьвяжа часткава сілы чырвонае арміі, накіраваныя на змаганьне з Польшчай.

Бальшавіцкая армія, аднак, імкнучыся на захад, зусім была памінула Віленшчыну, як пры наступе, гэтак і адступаючы, і Віленская прасторы засталася ў руках летувісаў.

Атрымаўшы гэткую бліскучую перамогу над бальшавіцкай арміяй пад Варшавай, і усталіўшы межы свайго гаспадарства далёка на ўсходзе, польскі ўрад, усё-ж, ня могучы прымірыцца з панаваньнем у Вільні летувісаў, зьмяніў свае пагляды ў дачыненьні да віленскага пытаньня.

І тутка йзноў польскі ўрад пайшоў на хітрасьць. Вырашана было разыграць камэдыю „бунту" польскага генэрала Жэлігоўскага, які быў вызначаны ў тыя часы на камандзіра Беларуска-Літоўскай Дывізыі.

Варта зачапіць тут асобу самога генэрала Жэлігоўскага — галоўнага выканальніка славутага „бунту".

Ген. Жэлігоўскі быў па паходжаньні беларусам з Горадзеншчыны, які, бываючы ў гады аб якіх гутарка ў Менску й Вільні і сутыкаючыся ці раз з беларускімі дзеячамі, хваліўся ім сваёй добрай знаёмасьцяй беларускае мовы й літаратуры, у доказ чаго любіў дэклямаваць вынятькі з ведамае беларускае паэмы „Тарас на Парнасе". Але душою ён быў цалкам адданы польскай справе й калі гэтага не вымагала палітыка, лічыў сябе паляком.

Аднак, паходжаньне Жэлігоўскага й ягоная знаёмасьць із беларускай мовай цалкам забясьпечвалі польскі ўрад перад Заходняй Эўропай, калі-б з факту „бунту", які пярэчыў міжнародным пастановам, Польшча мусіла-б тлумачыцца перад сьветам. „Бунт" гэты, кіраваны генэралам-беларусам з народжэньня й праведзены вайсковай адзінкай, якая складалася ў вялізарнай бальшыні з жаўнераў, што паходзілі якраз з прасторы, якую яны йшлі „вызваляць", мог-бы

Беларусь і партыйныя кар'еры

(Канец з 2 бал.)

У пасьляваенную пару на рахунак Панамарэнкі можна залічыць гэткія рэчы, як новую хвалю жорсткіх караў у дачыненьні да беларускага жыхарства, што на працягу колькіх год апынуўшыся было пад нямецкай акупацыяй, новыя турмы, выгнаньні й сьмяротныя прысуды. Каб сьцерці з беларускае зямлі ўсялякія рэшткі разбуджанага за нямецкіх часоў нацыянальнага патрыятызму, Панамарэнка ўзяўся масава высылаць ды перасяляць беларусаў у былыя нямецкія правінцыі ды на далёкую поўнач. Гэта ён гадамі трымаў беларускае сялянства ў зямлянках і воўчых ямах, не даваў беларускім работнікам законнага адпачынку, заганяючы пасьля шматгадзіннае працы адбудоўваць дамы для партыйных і савецкіх установаў ці маскоўскіх урадаўцаў.

Усё гэта ізноў прычынілася да новага задаваленьня Масквы. Панамарэнку адклікалі з Беларусі й на жаданьне Сталіна перавялі ў Маскву, у апарат ЦК, дзе Панамарэнка атрымаў ужо вельмі высокую пасаду ў Сакратарыяце Партыі, стаючыся аднэй з найбліжэйшых да Сталіна асобаў. Як пасол ягоны й адначасна пасол ЦК — Панамарэнка неўзабаве едзе ў Польшчу, дзе наладжвае патрэбныя Сталіну парадкі і, трэба думаць, не шкадуе пры гэтым ні ворагаў, ні сяброў. У выніку дзейнасьці ў Польшчы, Панамарэнка вызначаецца кіраўніком усіх партыйных кадраў.

У рэшце-ж рэштаў на апошнім 19 Зьезьдзе камуністычнае партыі Панамарэнка „выбіраецца" (чытай — вызначаецца Сталіным) у сябры новага Прэзыдыюму ЦК, ды яшчэ і ў склад Сакратарыяту. Усё значаньне гэтага будзе ясным толькі тады, калі мы ўявім сабе, што Прэзыдыюм ЦК — замяніў дыктатарскую ўстанову Палітбюро, а Сакратарыят выконвае функцыі яшчэ больш „інтымныя", будучы групаю найбліжэйшых і найадданейшых Сталіну людзёў. Для радавога сябры камуністычнае партыі, якім быў і ёсць Панамарэнка, гэта нікім не прадбачаная, прост немагчымая, здавалася-б, кар'ера. Па сутнасьці Панамарэнка выпераджае цяпер шмат якіх былых ды й сяньняшніх партыйных багоў. У руках Панамарэнкі, як кіраўніка ўсіх партыйных кадраў, знаходзіцца вялізарная ўлада, ён стаецца непасярэдным супрацоўнікам Маленкова (які кіруе усім апаратам ЦК), а зь ім і давераным усіх таемных думкаў ды чынаў Сталіна.

Вось якіх вышыняў дапяў Панамарэнка, ужыўшы паняволеную, патаптаную ім Беларусь як драбіну, зь якое ён скочыў на партыйны Алімп.

Спадкаемца Панамарэнкі — Гусараў, хоць таксама расеяц, вызначаны на пасаду Масквою із складу працаўнікоў ЦК, не патрапіў дасягнуць навет часткі таго, што ягоны папярэднік. За ягонага кіравецтва забурлелі йзноў хвалі чарговых партыйных чысткаў, асабліва жорсткія ў нацыянальных рэспубліках, дзе нацыянальны элемэнт пачаў пасьля вайны ўзьнімаць галаву, чакаючы на абяцаныя рэформы й зьмены партыйнае палітыкі. Сталін наважыў вымясьці зялезнай мятлой усе гэтыя настроі. На Украіну й Беларусь былі з гэтай мэтай пасланыя адмыслова ўпаўнаважаныя асобы і пры другом гэткай, зусім нядаўнай чысткі, Гусараў ня ўтрымаўся й зьляцеў з свае пасады (на Украіне, аднак, Хрушчоў усёткі ўтрымаўся, пэўне з прычыны сваяго сваяўства з Маленковым). Дзе сяньня Гусараў — нямаведама.

Чарговым правадыром Беларусі стаўся апошнім часам Патолічаў, паводле папярэдніх вузораў прысланы з маскоўскага апарату ЦК расеяц. Гэты сяньняшні „гаспадар" БССР як відаць, больш набліжаны да постаці Панамарэнкі. За кароткі час ён пасьпеў высунуцца ў апініі ЦК. На апошнім 19-тым зьезьдзе партыі Патолічаў быў выбраны ў склад Прэзыдыюму З'езду. Патолічаву было даручанае прачытаць на зьезьдзе даклад аб „асушэньні балатоў у Беларусі", што мелася сьветчыць аб ці малой праяве ўвагі партыі" да Беларусі й ейнага „правадыра". Цяпер Патолічаў выбраны ў склад вышэйшага партыйнага органу — Прэзыдыюму ЦК й будзе сядзець побач із Панамарэнкам. Аднак, да апошняга Патолічаву яшчэ вельмі й вельмі далёка.

Колькіх ахвяраў гэта будзе каштаваць Беларусь — цяжка сяньня навет уявіць.

быць зусім добра вытлумачаны. У выпадку патрэбы, польскія палітыкі маглі-б навет прадставіць гэтае здарэньне, як „бунт" беларуса супраць Польшчы.

З гэтаю мэтаю, рыхтуючыся да выступленьня Жэлігоўскага, палякі правялі сярод жаўнераў Беларуска-Літоўскае дывізыі адмысловую агітацыю. Віленчукам (а сюды заліча́ліся усе беларусы з Віленшчыны і Вялейшчыны), якія мелі ўжо досыць вайны за чужую, як яны пабачылі, справу, угаварвалася, што каб бацькаўшчына іхная не знаходзілася пад чужацкай (у гэтым выпадку літоўскай) акупацыяй, яны маглі-б неўзабаве вярнуцца да хаты, а таму што вайна гэтая каштавала шмат намаганьняў і іхнае крыві, дык ня выпадае вярнуцца у свае вёскі йнакш, як пераможнікамі над кажным акупантам.

Ня дзіва, што пасьля гэткае агітацыі, калі ген. Жэлігоўскі даў дывізыі загад машыраваць на Вільню, жаўнеры, псыхічна да гэтага кроку падрыхтаваныя, із энтузыязмам пайшлі на новае змаганьне. Загартаваныя ў баёх з бальшавікамі, яны бяз цяжкасьцяў прымусілі летувісаў адыйсьці за лінію, якая й сталася дзяржаўнай мяжой Летувы аж да 1939 году.

Заняцьце Вільні было апошнім баявым чынам Беларуска-Літоўскае Дывізыі, хоць яна праіснавала яшчэ два гады, поўнячы службу па ахове польска-летувіскае мяжы.

Захапіўшы Вільню й Віленшчыну, Польшча спыніла ваенныя дзеяньні й прыступіла да рэарганізацыі свае арміі. Назоў Беларуска-Літоўская Дывізыя, саслужыўшы паляком гэткую добрую службу, быў адкінены. Палкі, праўда, засталіся, але атрымалі заместа назоваў Менскі, Наваградзкі й г. п. нумяры, як 86, 80 і інш. Папаўняць іх пачалі рэкрутамі з этнаграфічнае Польшчы й Польскага Памор'я.

Гэтак, беларусы былі вельмі спрытна выкарыстаныя для справы польскае дзяржавы, якая, як паказалі гады польскае акупацыі ў Заходняй Беларусі, што трывала аж да 1939 году, была цалкам варожая да нашае нацыі й ня йшла далей звычайнае палянізацыі нашага народу.

Гэткі лёс кажнага, хто ня мае собскага незалежнага гаспадарства.

На працягу стагодзьдзяў Беларусы пралілі мора крыві за чужыя імкненьні. Косьці нашыя тлеюць і рассыпаюцца на попел і пад Сэвастопалем, і на палёх Манджурыі, і пад Варшавай, і пад Монтэ-Касыно, а за гэтае мы ўсьцяж яшчэ дастаем заплату няволяй і зьдзекам. І толькі здабыцьцё собскае незалежнае дзяржавы дасьць нам нарэшце вызваленьне ад усіх няпрошаных апякуноў і іхных чужых і варожых для нас справаў.

Ф. Кушэль.

АТРЫМАНЫ ГРОШЫ НА ГАЗЭТУ „БЕЛАРУС".

1.	Ад сп. А. Валюшкі	3 дал.
2.	Ад сп. Тэлеша Аляксандра	3 дал.
3.	Ад сп. Жыхара К.	2,50
4.	Ад сп.-ні Войтанчыхі М.	4 дал.
5.	Ад сп. Яцкевіча Д. з Аўстраліі	1 фунт аўстр.
6.	Ад сп. Карніловіча (за праданыя нумары)	4,60
7.	Ад сп. Літвіна В.	2,50
8.	Ад сп. Панасені	1 дал.
9.	Ад сп. Алексага	50 ц.
10.	Ад сп. Карніловіча (за кальпартаж)	5 дал.
	Разам	26 дал. і 1 фунт аўстр.

З Беларускага Жыцьця

РЭФЭРАТ АБ БЕЛАРУСКАЙ МУЗЫЦЫ

У нядзелю, 9 лістапада, Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва ладзіць ў Ню Ёрку навуковы рэфэрат аб беларускай народнай музыцы.

Рэфэрат будзе чытаць ведамы кампазытар і беларускі музыкавед праф. Мікола Куліковіч, які ад даўжэйшага часу займаецца вывучэньнем беларускага музычнага фольклёру й мае напісаныя працы аб беларускай народнай песьні ды ёсьць аўтарам кнігі „Гісторыя беларускай музыкі" (кніга друкуецца ў выданьні Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва).

У рэфэраце кампазытар мае намер прыраўнаць тыповыя ўзоры старадаўнага нашага музычнага фольклёру да старавечных пачаткаў музычнай культуры Грэцыі, Шатляндыі, Кітаю, а таксама выказаць характэрныя беларускія музычныя элемэнты ў творах выдатных музыкаў, як Глінка, Мусоргскі й сучасьнікі. Рэфэрат будзе ілюстраваны прыкладамі на фартапіяне й у выкананьні ведамай нашей опэрнай сьпявачкі Барбары Вержбаловіч.

ПРАЦЫ БЕЛАРУСА — НА ЦІХААКІЯНСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ВЫСТАЎЦЫ.

Як падае канадыйскае прэсавее агенства й канадыйскія газэты, ведамы наш майстра арнамэнатальнай мініятурнай мазаікі з саломы — Мікола Сільвановіч, аб чым цікавым мастацтве мы ўжо калісьці пісалі на балонках нашае газэты, кіраўнік шыракаведамае колькі год тааму ў Нямеччыне беларускай каапэратаўна-мастацкай майстроўні „Раніца", быў кагадзе запрошаны да ўдзелу у Ціхаакіянскай нацыянальнай выстаўцы (Pacific National Exibition). Выстаўка гэтая адбывалася ад 20-га жніўня па 1-е верасьня ў горадзе Ванкувэры ў Канадзе. Спадар Сільвановіч выставіў дзьве працы; выкананыя ім ужо ў Канадзе.

Абедзьве гэтыя працы выклікалі вялікае зацікаўленьне наведвальнікаў выставы. За іхнае мастацкае выкананьне сп. Сільвановіч быў узнагароджаны адмысловай граматай (Special award). Гэта ўжо другая ўзнагарода, атрыманая нашым мастаком на эміграцыі. Першую ён атрымаў на міжнароднай выстаўцы працаў ДП ў 1948 годзе у Байройце (Нямеччына).

ГАДАВЫ СХОД ЗАДЗІНОЧАНЬНЯ БЕЛАРУСКІХ ВЭТЭРАНАЎ АДДЗЕЛУ НЮ-ЁРК.

19-га кастрычніка сёлета ў памешканьні Беларускае Хаткі адбыўся гадавы сход Задзіночаньня Беларускіх Вэтэранаў аддзелу Ню-Ёрк.

На парадку дня былі гэткія пытаньні:

1. Справаздача Ураду ЗБВ з працы, праведзенай урадам на працягу мінулага году.
2. Выбары Ураду ЗБВ аддзел Ню-Ёрк на наступны год.
3. Розныя справы.

Старшыня Ураду ЗБВ аддзел Ню-Ёрк сп. надлэйтенант Д. Клінцэвіч здаў лічбу з працы ўраду за мінулы год. Пасьля гэтага адбылася дыскусыя над справаздачай. На працягу дыскусыі высьвятлілася, што Урад ЗБВ блізу цалкам выканаў у мінулым годзе ўсе узложаныя на яго агульным сходам заданьні. Некаторыя недацягненьні, заўважаныя ў працы ўраду ў мінулым годзе выясьняюцца вылучна умовамі жыцьця як сяброў Ураду,так і цяжкай заробкавай працай ўсіх сяброў аддзелу.

Сход аднагалосна ўдзяліў адыходзячаму Ураду абсалюторыюм.

У склад новага Ураду ЗБВ аддзел Ню-Ёрк былі выбраныя:

На старшыню — надлейтанант Савёнак Лявон, на сяброў — надлейтананты: М. Тулейка і Б. Данілюк.

Згодна із пастановаю сяброў сходу, першым заданьнем узложаным імі на новы Урад ЗБВ — будзе наладжаньне 32-х УГОДКАУ СЛУЦКАГА ПАУСТАНЬНЯ, якое прыпадае на дзень 27 лістапада сёлета.

Пасьля абмену думкамі ў справе розных жыцьцёвых справаў Задзіночаньня, гадавы сход Задзіночаньня Беларускіх Вэтэранаў быў зачынены, а новы ўрад прыступіў да працы.

Вайсковы.

ДЗЕНЬ КАЛЮМБА У КЛІЎЛЭНДЗЕ

З нагоды сьвята Дзень Калюмба ў Кліўлэндзе ў сыботу 11-га кастрычніка адбыўся традыцыйны парад, у якім першы раз у гісторыі гораду прынялі ўдзел і беларусы.

Яшчэ за месяц да параду Камітэт Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня атрымаў афіцыйныя запросіны выдэлегаваць свайго прадстаўніка ў гарадзкі штаб арганізацыі параду. Відаць, удзел беларусаў у сцэнічным фэстывалі народаў гораду, частыя публікацыі ў мясцовай амэрыканскай прэсе, канцэрты й іншыя імпрэзы спрычыніліся да таго, што аддзел Задзіночаньня стаўся ўжо ведамай у горадзе арганізацыяй.

На заклік Камітэту сябры аддзелу масава выйшлі на парад. Дзеля таго-ж, што беларуская група была аднэй з большых, яны йшлі першымі ў 5-ай калёне, і ім была прыдзеленая аркестра Сэн Эдвардс Гай Скул.

Бальшыня беларускае групы была апраненая ў беларускую нацыянальную вопратку. З бел-чырвона-белым і амэрыканскім сьцягамі й плякатамі прост на зьдзіўленьне стройна йшлі беларускія шэрагі. Прыгожа пераліваліся колеры апраткі ў вячорным асьвятленьні вуліцаў. Таму ня дзіва, што публіка з ходзішчаў часта пляскала й крычэла: „Беларусы з вэсту! Брава!" Калі-ж беларуская група падыйшла да трыбуны, галасьнік абвесьціў: „Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне". Улады на трыбуне прывіталі беларусаў дружнымі воплескамі. Так годна яшчэ раз беларусы зарэпрэзэнтавалі свой народ у горадзе.

БЕЛАРУСЫ У БІКАНЕ.

26-га кастрычніка 1952 году старшыня галоўнага ўраду БАЗА сп. Кушэль наведаў беларусаў у мясцовасьці Бікан.

У мястэчку Бікан шмат старое беларускае эміграцыі, а ў апошнія гады тутэйшая беларуская калёнія папоўнілася й беларусамі — новымі эмігрантамі, якія пакінулі бацькаўшчыну, ратуючыся перад бальшавіцкім тэрорам. Г. зв. „старыя" беларусы выехалі з Беларусі яшчэ за царскіх часоў. Яны не перажылі ні вайны, ні савецкага прыгнёту й таму ў бальшыні ня ведаюць праўды аб жыцьці ў Саветах, часта-густа стаючыся ахвярамі хлусьлівае бальшавіцкае прапаганды, якая ўгаварвае сьвету, што нідзе няма гэткага раю, як пад сонцам Сталіна.

Наадварот, „новая" эміграцыя, якая ўдосыць накаштавалася бальшавіцкага мёду й сама пазнала усе асалоды камуністычнага „раю". — ведае цану бальшавіцкае прапаганды й шчыра аб гэтым гаворыць. З гэтае прычыны паміж „старой" і „новай" эміграцыяй існуюць і тутка некаторыя разыходжаньні. Аднак, у апошнім часе й старая беларуская эміграцыя пачынае ўжо разумець вартасьць бальшавіцкае маны. Трэба спадзявацца, што з цягам часу яна цалкам вызваліцца з пад уплываў бальшавіцкае прапаганды, зразумее імкненьні новае беларускае эміграцыі і пойдзе зь ёю разам, запраўды як дзеці аднае сямі.

Дачуўшыся аб прыезьдзе ў Бікан старшыні БАЗА, усе сьведамыя беларусы мястэчка сыйшліся ў адно памешканьне, дзе й выслухалі дакладу старшыні аб беларускай справе на эміграцыі наагул, а ў ЗША асабліва, а таксама аб беларускім пытаньні ў міжнароднай палітыцы.

Пасьля дакладу прысутныя зьвярнуліся да дакладчыка з цэлаю вязкаю розных пытаньняў з галіны беларускіх справаў — арганізацыйных, рэлігійных, культурных і г. д.

Праваслаўныя беларусы прасілі старшыню, каб Урад БАЗА, у паразуменьні з япіскапам БАПЦ прыдзялілі ім свайго беларускага сьвятара, калі не на стала, дык прынамся гэтак, каб хоць пару раз на месяц наш сьвятар мог прыяжджаць у Бікан і мець тутка Божыя службы.

Перад канцом сходу прысутнымі былі выбраныя два прадстаўнікі, дзеля трыманьня сталае лучнасьці з Галоўным Урадам БАЗА.

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

Ветліва прашу зьмесьціць у Вашай паважанай газэце наступную зацемку:

Цяперашні адрыс В. Пануцэвіча й Э. Будзькі —

2042 W., St. Paul Ave, Chicago 47, Illinois, U. S. A.

З пашанай

В. Пануцэвіч

Саветы й Задзіночаныя Нацыі

Эўрапэйскія й амэрыканскія газэты, фатаздымкі, кіно й радыё аддаюць апошнім часам вялікую ўвагу прыезду новых савецкіх дыпляматаў: Зарубіна — новага пасла СССР у ЗША й Зорына — новага старшыні савецкае дэлегацыі ў Задзіночаных Нацыях, што прысланы на месца Маліка. Зацікаўленьне гэтае падаграецца яшчэ й тым, што былы старшыня савецкае дэлегацыі ў Задзіночаныя Нацыі — Малік — сьпярша зусім ня зьбіраўся пакідаць сваю пасаду, а толькі выяжджаў у чарговы адпачынак, купіўшы ўжо й білеты на параплаў, ажно раптам прыйшоў загад з Масквы — чакаць Маліку на наступніка Зорына.

Савецкая дэлегацыя ў Задзіночаныя Нацыі зусім ня дрэнна чуецца ў Амэрыцы. Раней яна арандавала прыгожы маёнтак знанага фінансісты Моргана, але амэрыканскім грамадзянам, што жылі паблізу сялібы саветчыкаў, так не падабаліся іхныя паводзіны й авантуры, што яны пастараліся шляхам пратэстаў і скаргаў пазбыцца гэтага „добрага суседзтва". Савецкім дэлегатам давялося пакінуць ваколіцу й Малік купіў на рахунак СССР вялікі маёнтак былога Ню-Ёрскага губэрнатара із 15 акрамі зямлі, двупаверхавым домам на 38 пакояў і басэйнам дзеля плаваньня. Як бачым, саветы на гэткія панскія выгоды золата не шкадуюць.

Усе сябры дэлегацыі маюць дыпляматычную недатыкальнасьць і карыстаюцца абаронай і дапамогаю амэрыканскага ўраду.

А што робіць савецкая дэлегацыя ў арганізацыі Задзіночаных Нацыяў? Яна праславілася тутка тым, што ў кажную іхную пастанову, як той кій у колы, устаўляе перашкоды, абструкцыі, спэцыялізуецца ў сабатажах, ігнараваньні, зацягваньні, ды іншых мэтадах савецкага „мірнага супрацоўніцтва". „Найадважней цым змагаром" у гэтай галіне быў дагэтуль сам старшыня савецкае дэлегацыі — Малік. Ён карыстаўся на кажным паседжаньні ўсімі дазволенымі й недазволенымі нагодамі забіраць слова, прамаўляючы па дзьве-тры гадзіны. Пamінаючы ўжо гэтую траскатлівую савецкую прапаганду, Малік вайстрыў свой язык на лаянцы й ганьбаваньні Амэрыкі й амэрыканцаў, не саромячыся выразаў, якія звыклыя да вэрсальскіх паводзінаў дыпляматы Захаду, у пяршыню хіба пачулі ў гэткім высокім мейсцы. Амэрыканскія грамадзяне, аднак, беглі на выступы Маліка як на прадстаўленьні вядомых цырковых клёўнаў-рыжых. Малік узбуджаў іхныя нэрвы й трымаў сваймі „моцнымі" слоўкамі ў напяцьці й слухачоў з вуліцы, й сяброў Арганізацыі З. Н. Пры Маліку на пастановы Рады Бясьпекі А. Н. было накладзенае 55-ае савецкае вэта (забарона), інакш кажучы, адкінена 55 пастановаў вялікае міжнароднае вагі. Асабліва быў „разгарнуўшыся" Малік у апошніх месяцах свайго ўрадваньня. Відаць, ён зарабляў сабе палітычны капітал на будучыню, не шкадуючы сілаў ды намаганьняў. На галовы Трумана, абодвух кандыдатаў у прэзыдэнты — Стывенсона й Айзэнгаўэра, на амэрыканскі ўрад і навет на амэрыканскі народ, Малік пасьпеў выліць за гэты час столькі памыяў, што іх хапіла-б на даўгія гады. На апошнім паседжаньні Рады Бясьпекі Малік пабіў, аднак, усе рэкорды: на працягу трох хвілінаў ён пасьпеў абвесьціць аж тры вэты ў справе пастановаў вялізарнае бальшыні Рады.

Некаторыя амэрыканскія палітычныя камэнтатары хочуць бачыць у замене Маліка Зорыным нейкую новую палітыку Крамлю. Яны ўсяцяж яшчэ ня ведаюць, што бальшавіцкую палітыку робяць ня людзі, ня Зорыны й ня Малікі, а Сталін ды Палітбюро, і што савецкія дыпляматы толькі хвігуркі на шахматнай дошцы. Яны зьмяняюць постаці, твары, можа выразы й характары, але істота іхная — застаецца тая самая. Новыя птушкі, — ды песьні старыя.